# Тышкевічазнаўства: *цікава і актуальна*

***З 14 па 16 мая з ініцыятывы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў былі праведзеныя V Міжнародныя Тышкевіцкія чытанні на тэму «Рэпрэзентацыя і музеефікацыя творчай спадчыны Тышкевічаў у Беларусі і Літве». Тышкевіцкія чытанні – гэта вялікі навуковы праект кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства і кафедры культуралогіі БДУКіМ, які ладзіцца раз на два гады дзякуючы доктару гістарычных навук Марыі Бяспалай і доктару культуралогіі Аляксандру Смоліку.***

Гэтым разам чытанні праводзіліся ў два этапы: спачатку ў Мінску, а затым у літоўскім горадзе Крэцінге ў Музеі графаў Тышкевічаў (іх былым палацы).



*А. Смолік*

Адзначым, што цікавасць да матэрыяльнай і духоўнай спадчыны гэтага роду ў нашай краіне пастаянна ўзрастае: на сёння адрэстаўраваныя палацы ў Валожыне і Свіслачы, адноўленыя касцёлы ў Лагойску і Валожыне, створаныя экспазіцыі ў валожынскім, вілейскім, лагойскім і свіслацкім гісторыка-краязнаўчых музеях; тэмы, звязаныя са спадчынай графскага роду, абмяркоўваюцца на прэстыжных навуковых форумах Беларусі. І гэта нядзіўна, бо Тышкевічы займаліся дабрачыннай, мецэнацкай, навуковай дзейнасцю, унеслі вялікі ўклад у эканамічнае развіццё Беларусі, Літвы ды іншых краінаў.

Да вывучэння шматграннай дзейнасці Тышкевічаў звярталіся ў сваіх грунтоўных працах беларускія гісторыкі Анатоль Грыцкевіч, Генадзь Каханоўскі, Аляксандр Гужалоўскі, Гурый Барышаў і іншыя.

Прафесар А. Смолік у артыкуле «Тышкевічазнаўства ў Беларусі: здабыткі і праблемы» адзначыў, што звяртацца да навуковай спадчыны Тышкевічаў пачалі яшчэ ў XIX стагоддзі: напрыклад, беларускі археолаг Адам Кіркор у артыкуле «Литовские древности» ў 1854 годзе.

Кандыдат гістарычных навук Г. Каханоўскі ў манаграфіі



*М. Бяспалая*

«Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі ў XVI – XIX стст.» прааналізаваў навуковую дзейнасць братоў Тышкевічаў. А ў манаграфіі «Руплівец нашай старасветчыны: Яўстах Тышкевіч» аўтар асвятляе краязнаўчы аспект дзейнасці выбітных асобаў.

Гісторыкі Георгій Галенчанка і А. Паўлава пісалі аб тышкевіцкіх архівах. Беларускі музеязнаўца А. Гужалоўскі прысвяціў асобную працу Віленскаму музею старажытнасцяў, дзе прасачыў працэс першай музеефікацыі матэрыяльнай і духоўнай культуры беларускага этнасу.

Знакаміты даследчык Г. Барышаў у працы «Маёнткавыя прыгонныя тэатры на Беларусі» піша пра тэатры ў Свіслачы і Плешчаніцах. А на сёлетніх чытаннях цікавы даклад аб маёнткавай спадчыне Тышкевічаў у Свіслачы зрабіла дацэнт кафедры культуралогіі БДУКіМ Людміла Кухто. Аспірантка ж кафедры Ульяна Жылко напісала артыкул «Тэатр Тышкевічаў у Свіслачы як культурны асяродак канца XVIII – пачатку XIX ст.».

Выступілі таксама беларускія даследчыкі В. Вярбіцкая, Д. Смолік, П. Ігнатовіч, І. Бамбешка і іншыя.

Прафесар М. Бяспалая распавяла, як род Тышкевічаў прадстаўлены ў мемуарнай літаратуры. Магістр культуралогіі Анастасія Комлік-Ямаціна даследавала элементы старажытнай сімволікі на гербе роду Тышкевічаў. Магістрантка кафедры культуралогіі Алена Кавалеяя прааналізавала твор Я. Тышкевіча «Opisanie powiatu Borysow-skiego», а ваш карэспандэнт разгледзеў гісторыю лагойскага і валожынскага касцёлаў, фундатарамі якіх таксама выступілі Тышкевічы.

Галоўны бібліёграф Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Ксенія Суша вызначыла месца братоў Тышкевічаў у беларускіх універсальных, рэгіянальных, біяграфічных і галіновых энцыклапедыях.

Вельмі цікавыя даклады зрабілі літоўскія калегі. Намеснік дырэктара па навуковай дзейнасці Крэцінгскага музея Юліус Канарскас распавёў аб графскім родзе Тышкевічаў з Крэцінге; доктар гістарычных навук Алдона Сніткувене – аб калекцыйных зборах Мікалая Тышкевіча; гісторык культуры Анджэй Пілецкі – аб дзейнасці Яна Тышкевіча.

Па выніках канферэнцыі была выдадзеная калектыўная манаграфія, дзе змешчаныя артыкулы. Яна ўжо выклікала вялікую цікавасць у беларускіх і літоўскіх навуковых колах.

Напрыканцы канферэнцыі ўдзельнікі вырашылі і надалей праводзіць чытанні ў міжнародным фармаце, таксама з далучэннем польскіх навукоўцаў.

*Павел САПОЦЬКА,*
*фота аўтара*



*Палац Тышкевічаў у Крэцінге*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ